УДК 141.78:130.2

# ПОСТМАДЭРН ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны аналізу постмадэрну ў якасці глабальнага сацыякультурнага праекта, супрацьпастаўленага праекту мадэрну. Разглядаецца гістарычны кантэкст фарміравання постмадэрнісцкай ідэалогіі, высвятляюцца характар і спецыфіка яго ўплыву на філасофію і культуру. Аналізуецца канцэптуалізацыя і катэгарызацыя асноўных ідэй. Акрэсліваюцца іх галоўныя напрамкі, якія накіраваны ў соцыум, прапануючы пэўны спектр сацыякультурных сэнсаў, а таксама адпаведных варыянтаў іх інтэрпрэтацыі на ўзроўні індывіда і грамадства. Раскрываецца эўрыстычны патэнцыял постмадэрнісцкага філасофскага дыскурсу.

**Ключавыя словы:** постмадэрн, мадэрн, філасофія, культура, грамадства, суб'ектыўнасць, рацыянальнасць, праект, тэкст, дыскурс, гіперрэальнасць, сімулякр, рызома, калектыўнае бессвядомае.

# POSTMODERN AS A SOCIO-CULTURAL REALITY

***V. Belakurski,***
*PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social and Humanitarian Disciplines of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

***Z. Belakurskaya,***
*PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communications and Advertising of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to the analysis of postmodernity as a global socio-cultural project, opposed to the project of modernity. The historical context of the formation of postmodern ideology is considered, the nature and specificity of its influence on philosophy and culture are clarified. The conceptualization and categorization of the main ideas are analyzed. Their main directions, which are directed towards society, are outlined, offering a certain spectrum of socio-cultural meanings, as well as corresponding options for their interpretation at the level of the individual and society. The heuristic potential of postmodern philosophical discourse is revealed.

**Keywords:** postmodern, modern, philosophy, culture, society, subjectivity, rationality, project, text, discourse, hyperreality, simulacrum, rhizome, collective unconscious.

Згодна з праектам «мадэрн», абаснаваным у працах заходнееўрапейскіх філосафаў Новага часу (Т. Гобс, Д. Лок і інш.), індывід уяўляе сабой істоту, якая спалучае у сваёй «прыродзе» эгаізм і розум. На больш познім і «вышэйшым» этапе ў культуры мадэрну замацавалася ўяўленне аб новым тыпе грамадскай канструкцыі на аснове дамінавання ідэй розуму, свабоды і справядлівасці.

Постмадэрн як эпоха, што прыйшла на змену мадэрну, у пэўнай меры абапіраецца на яго, будуючы іншую светапоглядную парадыгму. Сістэму суб'ект-аб'ектных адносін, што панавала раней, замянілі так званыя дыялогавыя камунікатыўныя дыскурсы, і ў навуковых працах выявіўся прынцыпова новы падыход да ўспрымання і ацэнкі рэчаіснасці.

Паняцце «постмадэрн» з'явілася значна раней той эпохі, якую яно абазначыць. У Заходняй Еўропе яно пачало ўжывацца ў першай палове ХХ ст. (Р. Панвіц, А. Тойнбі). Потым тэрмін распаўсюдзіўся ў еўрапейскім культурным асяроддзі, характарызуючы новыя плыні ў мастацтве, літаратуры і інш. У 1979 г. паняцце «постмадэрн» уведзена ў навуковы ўжытак філосафам Ж.-Ф. Ліатарам для характарыстыкі стану тагачаснай заходнееўрапейскай культуры* [4].

---

* Цытаты даюцца ў перакладзе аўтараў.

Адзначым, што ў 60–70-я гг. XX ст. адбываліся даволі сур'ёзныя змены ў свядомасці заходнееўрапейскага грамадства, яшчэ не да канца зразумелыя і асэнсаваныя ім тэарэтычна, а таксама не абазначаныя даследчыкамі ў якасці ўласна постмадэрнісцкіх. Гэтыя змены былі абумоўлены шэрагам падзей, найбольш важная з якіх – пераход развітых краін да постіндустрыяльнай эканомікі і інфармацыйнага грамадства. Падзеі такога кшталту прывялі чалавека Захаду да расчараванасці ў намаганнях перабудовы свету на аснове «вялікіх наратываў» мінулага (філасофскіх і палітычных праектаў). Акрамя таго, дадзены перыяд супадаў з распаўсюджаннем у Еўропе новых форм і стыляў мастацкай культуры, якія прынцыпова не ўпісваліся ў цесныя межы тагачасных традыцыйных падыходаў. Увесь гэты працэс не мог застацца па-за ўвагай навукоўцаў.

У Францыі ўзнікла ідэйная плынь, атрымаўшая назву постструктуралізму. Здольнасць выпрацаваць «эфект сэнсу» яго прадстаўнікі шукалі «ў структурах мовы» [5, с. 76]. Тэарэтыкі постструктуралізму (К. Леві-Строс, Р. Барт, Ж. Лакан, М. Фуко) ажыццявілі сур'ёзныя намаганні па ўключэнні новых паняццяў у арсенал тэарэтычнага мыслення («прастора тэксту», «гульня», «смерць аўтара», «археалогія ведаў», «дыскурс», «эпістэма»). Апошнія, на іх думку, выражалі характар змен, што нарасталі ў культурным асяроддзі. Дадзеныя паняцці паступова станавіліся метадалагічным падмуркам постмадэрну.

Постмадэрн заявіў аб сабе як філасофскі феномен ў 70–80-я гг. XX ст., дзякуючы працам Ж.-Ф. Ліатара, Ж. Бадрыяра, Ж. Дэрыда, Ж. Дэлёза, Ф. Гватары [1–5] і інш. Даследчыкі былі арыентаваны на адказ ад характэрнага для мадэрну логацэнтрызму. Узнікла ідэя «рызомнага мыслення», у якім аб'ект даследавання аказаўся семантычна дэцэнтраваным і семантычна нявызначаным. Галоўнымі пытаннямі, якія былі крытычна прааналізаваны, выступалі рэальнасць, гісторыя, філасофія, мова, веды, ісціна і інш. Постмадэрн рэзка адхіліў традыцыю суадносін тэкстаў культуры з рэальнасцю. Сама рэальнасць пачала разглядацца як тэкставая па сваёй структуры. Гістарычны працэс постмадэрністы ўспрымалі як добра абдуманую лагічную схему, штучна прыладжаную да мінулага. Таму засяродзілі ўвагу ў ім на феномене хаатызму, спрабуючы абвергнуць лагічную паслядоўнасць тых ці іншых падзей гісторыі.

Філасофія, у сваю чаргу, паўстала дзейнасцю, звязанай з рэпрэзентацыяй існасці, дзе яна, на думку постмадэрністаў,

заўсёды арыентавалася на самаабгрунтаванне і нейтралізацыю «іншага». Уводзілася паняцце «гіперрэальнага», якое вызначалася як «параджэнне пры дапамозе мадэлей рэальнага без вытокаў і рэальнасці» [1, с. 34]. Паводле Ж. Бадрыяра, «гіперрэальнае – сінтэтычны прадукт, выпраменьваемы адпаведнымі камбінацыямі мадэлей у беспаветраную гіперпрастору» [Там жа, с. 35].

У выніку метадалагічных навацый філосафы-постмадэрністы ажыццявілі «эпістэмалагічны пераход» да прынцыпова новага тыпу аб'ектаў з уласцівым ім рэлятывізмам і патэнцыяльнай невыразнасцю.

Крытычна разглядаючы постмадэрн з сучаснай сацыякультурнай пазіцыі, С. А. Краўчанка слушна адзначае: «Постмадэрн уяўляе сабою такую эпоху ў гісторыі чалавецтва, для якой характэрна нелінейнае развіццё, якаснае павелічэнне нявызначанасці шматлікіх сацыяльных рэалій, што звязана з верагоднасцю і альтэрнатыўнасцю напрамкаў развіцця, а таксама з узнікненнем той сацыяльнай реальнасці, у якой пануюць сімулякры і сімуляцыі. Для нелінейнай сацыякультурнай дынамікі натуральнымі з'яўляюцца разрывы соцыуму і рызомнае развіццё, што істотна садзейнічае падыходу да свайго канца ўсім знаёмага свету і стварэння свету новага, з новымі ўяўленнямі аб парадку і хаатызме» [3, с. 12].

Сапраўды, постмадэрн заявіў аб сабе негатыўным пафасам у адносінах да ўсялякіх пазітыўных ведаў, да ўсіх спроб рацыянальнага абгрунтавання феноменаў рэчаіснасці і, у першую чаргу, культуры. На думку постмадэрністаў [2; 4], сродкамі легітымацыі навукі эпохі мадэрну выступалі менавіта тыя наратывы, якія былі распрацаваны галоўным чынам у філасофіі. Яны легітымавалі не толькі навуковыя веды, але распаўсюдзіліся на розныя сацыяльныя інстытуты, а таксама формы сацыяльнай практыкі. На гэтай падставе прадстаўнікі постмадэрнізму імкнуліся абгрунтаваць цесную сувязь навукі з уладай праз філасофска-палітычныя тэксты мінулага, якія нібыта прадэманстравалі свой адназначна-рэпрэсіўны змест праз цесную сувязь з мовай (логасам). Таму выказвалася ідэя аб неабходнасці супрацьпастаўлення «дыктатуры» логаса так званай паралогіі з мноствам галасоў. «Для таго, каб гаварыць, патрэбны не адзін субяседнік, патрэбны некалькі галасоў», – сцвярджае Жак Дэрыда [2, с. 205]. Гэтая цытата адлюстроўвае ідэю Ж. Дэрыды аб тым, што любое выказванне або тэкст не з'яўляецца вынікам ізаляванага дзеяння аднаго гаворачага, а заўсёды мяркуе наяўнасць мноства ўплы-

ваў і ўзаемадзеянняў. Згодна з постмадэрнісцкім прынцыпам мыслення, – прынцыпам плюралізму – дапускалася адначасовае суіснаванне розных пунктаў погляду, без абсалютызацыі аднаго з іх як знойдзенай ісціны [3].

Разглядаючы постмадэрн як асобны сацыякультурны праект, можна вылучыць у ім наступныя характэрныя рысы:

– адмова ад антрапацэнтрычнай і наогул ад якой-небудзь агульнапрынятай карціны свету;

– успрыманне свету як тэксту (рэальнасць можна разглядаць як складаны тэкст, сістэму знакаў);

– адсутнасць строгай, сістэматычна выражанай канцэпцыі;

– адмаўленне ідэалагічнай дамінанты (факт наяўнасці апошняй разглядаўся як таталітарызм);

– «сімуляцыя» рэальнасці: разуменне соцыуму як сукупнасці знакаў, якія не маюць ніякай сувязі з рэчаіснасцю;

– адмаўленне грамадскага прагрэсу наогул.

Такім чынам, спалучэнне сучасных ліберальных каштоўнасцей з рызомнасцю, нестабільнасцю, хаатызацыяй усіх сфер жыцця індывіда на Захадзе (уключаючы духоўную сферу), з праліферацыяй сэнсаў і светапоглядных арыенціраў і сёння патрабуе далейшых даследаванняў тых парадыгмальных змен, якія справакавалі з'яўленне такога неадназначнага культурнага кантэнту.


1. *Бодрийяр, Ж.* Симулякры и симуляции / Жан Бодрийяр ; пер. с фр. А. Качалова. – М. : Постум, 2015. – 240 с. – (Технология свободы).

2. *Деррида, Ж.* Оставь это имя / Жак Деррида // Деконструкция: тексты и интерпретация / Ж. Деррида, Е. Гурко ; пер. с фр. Е. Гурко. – Минск, 2001. – С. 205–256.

3. *Кравченко, С. А.* Социологический постмодернизм: теоретические источники, концепции, словарь терминов / С. А. Кравченко. – М. : МГИМО-Университет, 2010. – 396 с.

4. *Лиотар, Ж.-Ф.* Состояние постмодерна / Жан-Франсуа Лиотар ; пер. с фр. Н. А. Шматко. – М. : Ин-т экспериментальной социологии; СПб. : Алетейя, 1998. – 160 с.

5. *Фуко, М.* Порядок дискурса : пер. с фр. / Мишель Фуко // Воля к истине: по ту сторону знания, власти и сексуальности / Мишель Фуко. – М., 1996. – С. 47–96.